**Апанасовіч Наталля Генадзьеўна**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай
e-mail: n.apanasovich@psu.by

# МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ У «РАЗВІТАЛЬНАЙ АПОВЕСЦІ» В. АДАМЧЫКА

***Анатацыя.*** Прааналізавана жанравая спецыфіка аповесці В. Адамчыка “Развітальная аповесць” у кантэксце часу і матыву вяртання дадому. Разглядаецца паліфанізм, лірычны, псіхалагічны пачаткі, філасафічнасць і публіцыстычнасць, з’явы двухчленнага паралелізму Выяўлены адметная спалучанасць роляў персанажа, наратара і аўтара. Раскрыта вобразна-кампазіцыйная стуктура, пабудаваная на антаганістычных супярэчнасцях і супрацьпастаўленнях, выяўленых на ўзроўні самапрэзентацыі, пачуццёвага ўспрыняцця рэчаіснасці, часу і гісторыі.

***Ключавыя словы:*** В. Адамчык, развітальная аповесць, сінтэтычнае пісьмо, двухчленны паралелізм, вёска, горад, мінулае, сучаснасць, развітанне, вяртанне.

**Natallia Apanasovich**
Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk
e-mail: n.apanasovich@psu.by

# PAST AND PRESENT IN V. ADAMCHIK’S «FAREWELL STORY»

***Abstract.*** the genre specificity of V Adamchik’s story «Farewell story» is analyzed in the context of the time and motive of returning home. The considered polyphonism, lyrical, psychological principles, philosophic and journalistic, the phenomena of two-term parallelism revealed the distinctive connectedness of the roles of the character, narrator and author. The article reveals a figurative and compositional structure based on antagonistic contradictions and oppositions expressed at the level of self-presentation, sensory perception of reality, time and history.

***Keywords:*** V. Adamchyk, farewell story, synthetic writing, two-term parallelism, village, city, past, present, farewell, return.

«Развітальная аповесць» В. Адамчыка была створана ў 1993–1994 гг. і стала своеасаблівым падсумаваннем творчага набытку пісьменніка ў мастацкім асэнсаванні шляху беларусаў у кантэксце гісторыі і часу. Аповесць напісана ў традыцыйнай для В. Адамчыка рэалістычнай манеры, мае сацыяльна-побытавы кантэкст, пабудавана на заходнебеларускім матэрыяле. Але адрозніваецца ад папярэдніх твораў аўтара моцным псіхалагічным пачаткам, лірызмам, філасафічнасцю. Паводле М. Тычыны, у прозе арыгінальна спалучыліся імкненне перадаць вострае адчуванне

хуткаплыннага жыцця і адначасова чыста рацыянальная прага усё патаемае зрабіць відавочным, за вонкавым – унутранае, за зямной плоццю – жывую душу [6, с. 8].

Твор з'яўляецца выразным сведчаннем творчай эвалюцыі пісьменніка да поліфаничнага, сінтэтычнага пісьма [2, с. 113], у якім злучаны эпічны, лірычны, псіхалагічны, дакументальны і рэалістычны пачаткі. Ускладненасць маўленчай формы праяўляецца ў своеасаблівым спалучэнні роляў наратара, персанажа і аўтара. Можна гаварыць пра спалучанасць аб'ектыўнага і суб'ектыўнага пачаткаў, калі перажыванні персанажа падаюцца праз яго рэфлексіі, а аўтар выступае то ў ролі назіральніка, чыя пазіцыя моцна эксплікуецца ў часава-прасторавай суаднесенасці з персанажам [5, с. 236] і выяўляецца ў тым ліку праз унутраныя развагі і перажыванні персанажа [2, с. 14], то выказваецца адкрыта ў форме аўтарскіх адступленняў – публіцыстычна афарбаваных філасофскіх разваг.

Рэалістычны, падзейны план жыцця пратаганіста, распавядаемы наратарам, – выйсце ў сферу суб'ектыўнага, якое раскрываецца праз адлюстраванне перажыванняў, спадзяванняў, страт, расчараванняў лірычнага героя. Летматывам гэтай гісторыі з'яўляецца развітанне. Паводле Н. Дамброўскай, у сферы аб'ектыўнага мастак актыўна шукае адбіткі перажыванняў, тлумачэнне з'яў і чалавечых учынкаў [2, с. 14].

З'явы неасінкрэтызму, зварот да «двухчленнага паралелізму», які на думку даследчыцы выяўлены ў малой прозе і раманнай творчасці В. Адамчыка [2, с. 19], прадстаўлены і ў даследуемым творы. Назва «Развітальная аповесць» імкне чытача да шматзначных паралеляў. Гэта і развітанне пратаганста са сваімі роднымі мясцінамі і ўсім, што з імі звязана: роднай вёскай, яе насельнікамі, бацькамі і мінулым жыццём. З тым, што блізкае і роднае, але разам з тым напоўнена супярэчлівымі і неадназначнымі адчуваннямі і ўспамінамі, часам балючымі і крыўднымі. Галоўны герой нібы развітваецца з маладосцю і мінулым жыццём, няспраўджанымі надзеямі і спадзяваннямі, сябрамі і знаёмымі, якія засталіся ў мінулым ці ўжо сышлі з жыцця або непазнавальна пастарэлі і змяніліся.

Сімвалічнасць назвы выразна расчытваецца і на ўзроўні аўтара, для якога гэты твор стаў своеасаблівым падсумаваннем не толькі творчага набытку, але і жыццёвага шляху. Гэта развітанне з вясковай бацькаўшчынай, традыцыйным жыццём, карцінай свету, якая змяняецца і паглынаецца імклівым часам, прагрэсам і гарадскім асяродзем. Назва твора, у пэўным сэнсе, – гэта яшчэ і аўтарскае вызначэнне жанру.

У аповесці падкрэсліваецца моцная знітаванасць мінулага і сучаснага, іх узаемапранікальнасць і ўзаемаабумоўленасць. Гэта спалучанасць прадстаўлена на ўзроўні асобасна-суб'ектыўным і філасофскім. Галоўны герой канстатуе: «Як жа мала чалавек верыць у сённяшні дзень і зусім не зважае, праўдзевей вельмі мала зважае на пражытае. Але ж яно было і яно ў нечым паўтараецца зноў» [1, с. 82].

Сучаснасць у аповесці паказана размежавальнай лініяй, якая з аднаго боку аддзяляе мінулыя старонкі жыцця, а з другога – адкрывае дзверы ў будучыню. Але якую?

Для галоўнага героя будучыня – гэта старасць і звязаныя з ёю адчуджанасць і адзінота, час «дажывання». Пасля смерці бацькі Генрык Самец згадваў пра тое, што ён «старэйшы за дзвюх сваіх сясцёр і чарга ўжо за ім» [1, с. 10]. Для пратаганіста, якому толькі 54 і «ранавата думаць пра смерць», будучыня [1, с. 10] гэта пачатак завяршальнага этапу жыцця. Падобныя адчуванні, іманентныя аўтарскім, сталі ў пэўнай ступені прарочымі. Твор быў напісаны В. Адамчыкам за сем гадоў да сыходу з жыцця ў складаныя і супярэчлівыя 90-я гг., у пасляперабудовачны час, калі мінулае было разбурана і страчана, а перспектывы будучыні падаваліся неакрэсленымі і змрочнымі.

Аснову твора складае аповед пра паездку на радзіму ў вёску галоўнага героя. Генрык Самец – былы вясковец, які, як і многія яго равеснікі, «хто скончыў школу і расстараўся пашпарта» [1, с. 57], у свой час аддаліся на волю невядомага, але зваблівага жыцця: «Уцяклі з глухое, збрыднелае і беднае вёскі, з разбэрсанага калгаса ў непрыветна-чужы, невядомы горад» [1, с. 57]. Пасля яшчэ недабудаванай з двума аконцамі, адным ложкам і дашчатым мулкім палком на печы, пасля шара-саламянай нуднай і вусцішнай вёскі Самец апынуўся ў людным, але самотным горадзе, чатырохпавярховым інтэрнаце ў светлым пакоі на 18 жалезных ложкаў, дзе жылі супольна студэнты і выкладчыкі. Сямейнае жыццё ў Генрыка не склалася, і яны з жонкай, пражыўшы шмат год, разышліся, калі яму было 52. Паводле А. Пяткевіча, В. Адамчык «стварыў вобраз беларускага інтэлігента свайго пакалення, які пранёс праз усё нялёгкае жыццё любоў да родных вясковых мясцін, захаваў у сабе ўражлівую душу, якая кліча дадому» [4, с. 101]. Месца дзяцінства, мар і спадзяванняў, цяпер занядбанае, пакінутае і бесперспектыўнае, пераўтварылася ў сімвал жыццёвых супярэчнасцей, згубы і разрыву каранёў. А. Пяткевіч адзначае, што пісьменнік паказаў тып вясковага інтэлігента ў першым пакаленні, выхаванага яшчэ на народна-маральных здабытках, з тонкай душэўнай арганізацыяй, які пад канец жыцця перажывае моцны крызіс адзіноты і страчанасці, праз тое, што не ўпісаўся ў сістэму сучаснага гарадскога жыцця [4, с. 102].

Аповесць пабудавана на антаганістычных супярэчнасцях і шматлікіх супрацьпастаўленнях, якія выяўляюцца на ўзроўні пачуццёвага ўспрыняцця рэчаіснасці, часу і гісторыі. Сучаснасць пададзена як непрадбачліва і непазнавальна зменены свет. Гэта найперш прастора горада, з грукатлівым метро, чадным аўтобусным дымам, аднастайнымі шэра-панельнымі мікрараёнамі і мноствам абыякавых, панурых, занятых сваімі думкамі насельнікаў, з таўкатнёй у чэргах, п’янствам, шкодніцтвам і сварбой людзей. Сярод гарадскога бязладдзя і адчуджанасці душа Генрыка Самца шукала нечага «замілавана-чыстага, не асаромленага ні злым словам, ні благім учынкам, ахутанага светлай пакорай і набожнасцю» [1, с. 24]. Яго «нібы

магнэзам цягнула да ўсяго даўняга, што здавалася ўжо найдаросшым і беззваротна страчаным, да тых сцежак, што помніліся змалку» [1, с. 24], імкнула ў мінулае. А яно было найперш звязана з вясковай прасторай, з роднымі мясцінамі, домам бацькоў.

Вандроўка, якую галоўны герой здзяйсняў свядома штогод, паказана як апошняя, развітальная. Былі на гэта і жыццёвыя падставы – прададзены сястрой бацькоўскі дом. Скрухі надавала і тое, што сястра – удава, што жыла ў далёкай Самары, прадала дом, не параіўшыся з ім, баючыся, што спадчына дастанецца Генрыку, як старэйшаму за яе нашчадку. Шлях да дому, куды Самец свядома ездзіў штогод, успрымаўся як заўсёдная дарога, як «дарога да свае памяці» [1, с. 82]. Да памяці, у якой ажывала светлае і прыгодніцкае дзяцінства, цнатлівая маладосць і смелыя спадзяванні, дзе разам з тым змяшчаўся прыглушаны, але «не забыты боль, адпакутаваная крыўда, нараканне і нават няспраўджаная помста» [1, с. 82].

Сучаснасць і мінулае ў творы звязаны праз памяць, успаміны, якія шматлікімі шыўкамі злучаюць часткі палатна. Вясковае мінулае ва ўспрыняцці пратаганіста неадназначнае, нягледзячы на моманты ідэалізацыі, якая разглядаецца хутчэй як праява чалавечай памяці – ахутваць флёрам рамантычнасці даўно перажытае, пакідаючы прыемнае і выдаляючы балючае і страшнае. Так, напрыклад, паступова выкрэслівалася памяць пра гліняны груд, які капалі для току і печаў у мірны час, у яме якога ў 41-м ляжалі, як горы, набрынялыя і счарнелыя трупы забітых савецкіх байцоў, гнаных немцамі з-пад Беластока.

Падарожжа ў родныя мясціны выклікала прыемныя, радасна-тужлівыя пачуцці, калі «сэрца занывала ад салодка-балючага смутку» [1, с. 69]. У рэтраспектыўных адсылках апяваецца прырода, яшчэ вольная ад чалавечага ўздзеяння і прагрэсу. «І не паспее яшчэ заднець, а ён ужо, шчасліва сцішэлы, як зайчаня сядзіць у сцюдзёным ранішнім аўтобусе» [1, с. 69], які выязджаў з настылых муроў горада на «абрусовы прастор» на лагодна спадзістых узгорках «насустрач прыдарожным дрэвам, што заўсёды тояць у сабе загадкавую вечнасць» [1, с. 69]. Прыгадваюцца гаваркія і зразумелыя вясковыя назвы. Так, «па-агароднаму зялёна і наіўна» [1, с. 73] названа Лапушанка. І яшчэ нязрэзаныя і не счарнелыя ад старасці дрэвы, «блізкія і па-свойску даверлівыя сваім мяккім, знаёмым змалку цёпла рахманым шэптам» [1, с. 71]. Вясковыя валуны пад трыножкаю маяка нязменна выклікалі ў Самца згадку пра вясковую легенду аб пераўтварэнне ў каменне валоў і чалавека, што выйшаў араць на Вялікдзень. Успамінаўся Генрыку драўляны дом павятовай бальніцы з двума чубатымі ганкамі, падпёртымі выштукванымі калонамі. Ад яго веяла таямнічаю даўніною, заможнасцю, шляхецтвам, якія зніклі пад стралой будаўнічага крана і сцяной новага будынка.

Рух часу, як метафізічная праява, успрымаецца як вышэйшая сіла і адзначаецца вокам аб'ектыўнага назіральніка, для якога вясковая прастора жывая: памірае

чорная адзінокая хата без хлява і гумна, акружаная па старэчы прыгнутымі яблынямі; прыемна здзіўляе ўцалелая хвойка, якая «нібы ў жалобным зломе ўздымала зялёныя галіны і балесна схілялася над ўсёю мёртваю і лядаю» [1, с. 71]. Аб’ектыўнае і непадуладнае чалавеку звязана ў аповесці праз суб’ектыўнае, асабісты лёс чалавека – этапы жыцця Генрыка Самца: «Пасля бацькавай смерці старая, складзеная са старых прыкупленых хлявоў хата раптоўна аглухла і пачужэла”, а пасля продажу дома «аглух і пачужэў і нібы аддаліўся ўвесь зыркі, знаёмы і велічны свет бацькаўшыны, усіх навакольных даляў, засінелых смугою лясоў» [1, с. 44]. Фокус асабістага канцэнтруе па-філасофску абагульненае: «Усё нечакана змізарнела і страціла свой ранейшы ясны колер і ўзнёслы сэнс роднасці. Усё было не толькі незнаёмым, чужым, але і іншакшым, непрыхільна-абыякавым» [1, с. 44].

Аўтар выразна прадстаўляе і размяжоўвае пачуццёвую сферу, метафізічнае і аб’ектыўную рэчаіснасць, якія прадстаўлены праз антынамічныя супрацьпастаўленні на розных узроўнях: асабістае, звязанае з прыватным жыццём і сям’ёй; грамадскае – веска і горад; дзяржаўнае – час польскі (даваенны), ваенны і пасляперабудовачную рэчаснасць. Супрацьпастаўляюцца дзяцінства і старасць, вёска і горад, сялянскія хаты і аднастайныя шматпавярховікі, прастора прыроды і ўладкаванасць вясковага жыцця і прыметы гарадской цывілізацыі (асфальтаваныя дарогі, разбітыя аўтобусы і «форды», «мэрсэдэсы» і «аўдзі», звінючае метро, тэлевізійныя трансляцыі, будаўніцтва і інш.). Адрозенні падкрэсліваюцца праз знаёмыя твары вяскоўцаў і жыхароў прылеглых мястэчкаў і чужых адзін аднаму, аб’яднаных у імклівы паток незнаёмыя гараджан, праз мову – сваю, беларускую, больш знаёмую польскую і мала вядомую рускую.

Прастора мінулага і сучаснага акрэслена культурна-гістарычнымі рэаліямі, якія ўдакладняюць час і грамадска-палітычную сітуацыю. Захонебеларускі кантэкст даваеннай вёскі маркіраваны праз прыметы дзяржаўна-палітычнага: рагатыўкі полькіх жаўнераў і форму «краснапагоннікаў», згадку пра рэпрэсіі і дзейнасць НКВД. Ваенны час, паказаны найперш, як час смерці, страху, бяспраўя і чалавечай знявагі. Гэта ілюстрацыя жыцця на акупаванай тэрыторыі, калі небяспека для вяскоўцаў сыходзіла з усіх бакоў: ад акупантаў, партызанаў і прадстаўнікоў саветаў. Жахлівасць натуральных вайсковых маркераў вайны – выбуховак і вінтовак, падкрэслена праз выкарыстаннеў у дзіцячых забавах. Праблематыка сучаснасці раскрываецца ў палітычным і маральна-этычным плане: праз згадкі пра пасяджэнні палітбюро і істэрычныя выступы дэпутатаў, рэпартажы пра надоі малака, з’явы п’янства і амаральнасці.

Мастацкае палатно твора маляўніча-жывапіснае, афарбаванае і агучанае, напоўненае пахамі. Можна гаварыць аб тым, што лірызм у аповесці прадстаўлены не ў родавым значэнні, а, згодна з меркаваннем Г.М. Паспелава, сканцэнтраваны ў пафасе і настроі твора, праз актыўную ідэйна-эмацыянальную ацэнку пісьменнікам

дадзеных ім сацыяльных характараў, якая нараджаецца іх аб’ектыўнай, унутранай супярэчнасцю і вынікае са светаразумення пісьменніка, з яго ідэалаў [3, с. 198].

Разам з тым неабходна вызначыць змрочнасць і песімістычнасць агульнай танальнасці аповеду, якая паглыбляе перажытае і ўзвышае да абагулена-філасофскага разумення імпрэсіяністычнай зменлівасці і трагічнай асуджанасці на забыццё і энтрапію [6, с. 8] ўсяго, што сыходзіць, страчваецца разам з чалавекам, калі належна не занатавана, не асэнсавана і не захавана.

Развагі Генрыка Самца аб маладосці і сталасці, пагардлівасці і нянавісці, вайне і міры, жыцці і смерці, колазвароце часу, прадстаўлены ў форме філасофскіх адступленняў, відавочна адлюстоўваць і аўтарскія думкі. У канцы твора гучыць голас самога аўтара, у публіцыстычна завостараных, эмацыйных адступленнях аб сэнсе чалавечага жыцця, яго складанай супярчлівасці ў пошуку гармоніі паміж узвышаным і будзённым, марамі і наканаваным, набыткам і страчаным: «Чаго ж тады шукала яна, збалелая чалавечая душа? А, можа, усяго толькі самую сябе, згубленую ў гэтым неспазнаным і бясконцым свеце? І, вядома, не знайшла. Як жа ж на страсці гадоў душа размінаецца з чалавекам» [1, с. 145] «< > але хіба можна ад ўсяго наканаванага ўцячы? Не!» [1, с. 146].

Звяртае на сябе ўвагу і прозвішча галоўнага героя – Самец, шматзначанае, адначасова звычайнае і акцэнтавана гаваркое. На наш погляд, у ім бачыцца прыхаваная аўтарская іронія, завуаляванае крытычнае стаўленне да прадвызначанага і наканаванага ў жыцці чалавека. Акцэнт на палавой семантыцы прозвішча дадае праблематыцы твора ракурс будучыні, калі прыродна-фізіялагічны пачатак, прадаўжэнне роду звязваюцца з адказнасцю чалавека за свой лёс, жыццё новых пакаленняў. Гэта своесаблівы папрок беларусам, за тое, што недастаткова зроблена дзеля саміх сябе, будучага народа, бацькаўшчыны.

Па меркаванні М. Тычны, у апошніх творах В. Адамчыка, адметна злучаны і споведзь, і пакаянне, і боль, і віна, і надзея [6, с. 8]. У мастацкай спадчыне пісьменніка «Развітальная аповесць» – твор асаблівы, у пэўнай ступені эксперыментальны і на ўзроўні жанравай формы, і па глыбіні ўзнятай праблематыкі, і па ўзроўню аўтарскай шчырасці.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Адамчык, В. Развітальная аповесць / В. Адамчык // Развітальная аповесць : аповесць, апавяданні, дзённікі. – Мн. : Маст. літ., 1999. – 448 с.
2. Дамброўская, Н. М. Проза Вячаслава Адамчыка: родава-жанравы і стылявы аспекты: Манаграфія / Н. М. Дамброўская. – Брэст : Альтернатива, 2009. – 182 с.
3. Поспелов, Г. Н. Лирика : Среди литературных родов / Г. Н. Поспелов. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1976. – 208 с.
4. Пяткевіч, А. Спрадвечнае вяртанне дадому / А. Пяткевіч // Старонкі спадчыны : культурнае памежжа Гродзеншчыны : працэсы, з’явы, асобы. – Мн. : Беларускі кнігазбор, 2006. – 240 с.

5. Старасценка, Т. Я. Суб’ектная сфера камунікатыўнай прасторы мастацкага дыскурсу / Т. Я. Старасценка // Стылістыка: мова, маўленне і тэкст [Электронны рэсурс] : матэрыялы V Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 100-годдзю заслуж. работніка адукацыі Рэсп. Беларусь, д-ра філал. навук, праф. М. Я. Цікоцкага, Мінск, 23–24 лют. 2022 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. М. Самусевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2022. – С. 230–238.
6. Тычына, М. А. Развітанне з сялянскай Атлантыдай. Вобразны свет Вячаслава Адамчыка / М. А. Тычына // Роднае слова. – 2003. – № 8. – С. 4–8.